Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт”

УДК 94 (476)

На правах рукапісу

Н-49

Глазырын
Сяргей Яўгенавіч

# Паўстанне 1863 года ў Віцебскай губерні

1-21 80 16 – айчынная гісторыя

Дысертацыя
на суісканне ступені магістра гістарычных навук

Навуковы кіраўнік:
Дук Д.У.
загадчык кафедры
айчыннай і ўсеагульнай гісторыі,
кандыдат гіст. навук

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М.Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Наваполацк, 2006

*20504503*

# ПЛАН

УВОДЗІНЫ.................................................. с.3-5
1. Рэвалюцыйная сітуацыя 1861-1862 гг. у Віцебскай губерні....................с.6-16
2. Паўстанне 1863 г. у Віцебскай губерні (студзень-травень)...............с.17-36
2.1. Дзейнасць павятовых рэвалюцыйных каімітэтаў (студзень-сакавік).................................................................................... с.17-22
2.2. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Віцебскай губерні (красавік-травень).................................................................................................с.23-28
2.3. Сяляне ў паўстанні 1863 г..................................................................с.28-33
2.4. Роля каталіцкага касцёла ў паўстанні 1863 г..............................с.33-36
3.Спад і падаўленне паўстання ў Віцебскай губерні (травень-снежань).с.37-41
ЗАКЛЮЧЭННЕ............................................................................с.42-43
ЛІТАРАТУРА.................................................................................с.44-45
ДАДАТАК......................................................................................с.46-54

# УВОДЗІНЫ

Тэма паўстання 1863 г. у Віцебскай губерні з'яўляецца вельмі актуальнай. Па-першае, вывучэнне дадзенай праблемы дае магчымасць прасачыць асаблівасці развіцця беларускага нацыянальна-вызваленчага руху канца XVIII – другой паловы XIX ст. Па-другое, аналіз падзей 1863 г. ў Віцебскай губерні дапаможа зрабіць больш поўнай карціну рэвалюцыйнай сітуацыі 1861-1863 гг. на тэрыторыі ўсей Беларусі. Па-трэцяе, неабходнасць вывучэння пазначанай праблемы абумоўлена тым фактам, што сучасная беларуская гістарыяграфія да сённяшняга моманту не мае комплекснага навуковага даследавання аб падзеях 1863 г. на Беларусі. Айчынныя гісторыкі абмяжоўваюцца невялікімі артыкуламі, якія закранаюць асобныя бакі нацыянальна-вызваленчага руху [3; 4; 14; 25; 27.], альбо ўздымаюць пытанне аб паўстанні ў кантэксце іншых аспектаў гісторыі Беларусі [11]. У-чацвертых, актуальнасць дадзенай тэмы павялічваецца ў сувязі з тым, што ў 2004 годзе гістарычная навука Беларусі, Польшчы, Літвы і Украіны адзначала 140-гадовы юбілей паўстання. Як і 140 год назад інтарэсы беларусаў, палякаў, літоўцаў ды украінцаў спалучыліся.

Зыходзячы з гэтага навізна работы палягае ў тым, што ўпершыню робіцца спроба падрабязнага і ўсебаковага аналізу падзей, якія мелі месца напярэдадні і ў час паўстання 1863 г. на тэрыторыі Віцебскай губерні.

Такім чынам, аб'ектам дадзенага даследавання з'яўляецца грамадска-палітычнае і нацыянальна-культурнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX ст.

Прадмет даследавання: грамадска-палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы, што адбываліся ў Віцебскай губерні ў 1861-1864 гг.

Мэта даследавання: даследаваць развіццё і ход паўстання на тэрыторыі Віцебскай губерні ў 1861 – 1863 гг.

Адпаведна пастаўленай мэце фармулюецца рабочая гіпотэза: у Віцебскай губерні ў перыяд падрыхтоўкі і падчас паўстання 1863 г. адбываліся аднолькавыя працэсы, якія мелі месца ў астатніх беларускіх і літоўскіх губернях, аднак на некаторых этапах развіцця нацыянальна-вызваленчай барацьбы Віцебская губерня мела выключнае значэнне ў рэалізацыі планаў паўстання ў цэлым на Беларусі.

Для ўсебаковага вывучэння пазначанай праблемы пастаўлены наступныя задачы:

1. Даць характарыстыку і вызначыць асаблівасці рэвалюцыйнай сітуацыі 1861-1862 гг. у Віцебскай губерні.
2. Паказаць асноўныя накірункі і асаблівасці дзейнасці павятовых рэвалюцыйных камітэтаў Віцебскай губерні.

3. Паказаць ход баявых дзеянняў і вызначыць асноўныя рухаючыя сілы паўстання на тэрыторыі Віцебскай губерні.
4. Вызначыць прычыны паражэння паўстання 1863 г. у Віцебскай губерні.
5. Раскрыць характар мерапрыемстваў царскага ўрада па задушэнню паўстання 1863 г. у Віцебскай губерні.

Даследаванне пабудавана на прынцыпах гістарызма, аб'ектыўнасці і сістэмнага падыходу. Актыўна выкарыстоўваліся гісторыка-параўнаўчы і рэтраспектыўны метады, метад мадэлявання. Пабудова матэрыялаў рабілася з дапамогай індуктыўнага метада.

Пры разглядзе гістарыяграфіі і першакрыніц , якія датычацца дадзенай праблемы неабходна улічваць некаторыя асаблівасці. У першую чаргу, трэба браць пад увагу тыя палітычныя варункі, у якіх развівалася гістарычная навука ў розныя гістарычныя эпохі. Так, працы гісторыкаў, асабліва першых дзесяцігоддзяў пасля паўстання, характарызуюць яго з пазіцый афіцыйнай палітыкі царызма. Гэта значыць, што з'ява нацыянальна-вызваленчай барацьбы 1863 г. вызначаецца імі, як негатыўная, антысацыяльная праява выключна польскага антаганізму. [5; 17; 22]. Гісторыкі 1910-30-х гг. (У. Ігнатоўскі, Д. Васілеўскі, Я. Віткоўскі) на хвалі новага этапу нацыянальнага беларускага руху бачылі ў паўстанні 1863 г. карані фарміравання беларускай нацыі, першую спробу (рэальную спробу) незалежніцкіх памкненняў. Гістарычную навуку другой паловы XX ст., асабліва 50-70-х гг., цікавіў збольшага эканамічны бок праблемы, іншымі словамі эканамічныя перадумовы ўзнікнення нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Некаторыя ўдзельнікі паўстання 1863 г., як лічылі савецкія гісторыкі (А. Смірноў, В. Д'якаў і інш.), з'яўляліся барацьбітамі за сацыяльную роўнасць, прапаведвалі ідэі сацыялістычнага грамадства, былі пачынальнікамі ўтапічнага камунізма.

Адной з найбольш поўных і комплексных прац, прысвечаных паўстанню 1863 г., з'яўляецца праца А.Ф.Смірнова "Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии" [23]. На падставе багатых матэрыялаў Віленскага, Маскоўскага і Пецярбургскага архіваў (фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Мінску Смірновым не выкарыстаны) аўтар вызначыў і прааналізаваў агульныя прычыны і мэты паўстання, апісаў і даў падрабязную характарыстыку баявых дзеянняў у асобных губернях. Што тычыцца падзей у Віцебскай губерні, дык звесткі пра іх невялікія і носяць збольшасці канстатацыйны характар. Асноўную ўвагу А.Смірноў звярнуў на Інфлянцкія паветы, якія, дарэчы, памылкова ўключыў у склад Віленскай губерні. Асноўным недахопам працы з'яўляецца тое, што яна не пазбаўлена савецкай ідэалагічнай абмежаванасці.

Адзіным уласна беларускім даследаваннем праблемы паўстання 1863 г. да сенняшняга часу застаецца манаграфічная работа У. Ігнатоўскага "1863 год

на Беларусі", надрукаваная, між іншым, у 1930 г. У ёй, таксама, дадзена даволі падрабязная характарыстыка асноўных этапаў нацыянальна-вызваленчай барацьбы на Беларусі, аднак інфармацыя пра падзеі ў Віцебскай губерні пададзена аўтарам спарадычна. Нягледзячы на гэта, праца з'яўляецца актуальнай з прычыны таго, што ў ёй выкарыстаны архіўныя дакументы, якія не захаваліся да нашага часу. [32]

Найбольш значнай і карыснай крыніцай для вывучэння падзей 1863 г. у Віцебскай губерні з'яўляюцца фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску [19]. Так, інфармацыя пра дзейнасць рэвалюцыйных арганізацый, асобных паўстанцкіх аддзелаў, пра некаторых паўстанцаў, а таксама пра колькасць асуджаных утрымліваецца ў фондзе 3046 (Матэрыялы Віцебскай следчай камісіі), дадзеныя пра баявыя дзеянні паўстанцаў, найбольш значныя бітвы змешчаны ў фондзе 1430 (Канцэлярыя віцебскага губернатара), мерапрыемствы па падаўленні паўстання, колькасць сасланых паўстанцаў і колькасць канфіскаванай маемасці палітычных асуджаных пададзены ў фондах: 1416 (Віцебскае губернскае праўленне), 2601 (Канцэлярыя ваеннага начальніка Дрысенскага павета), 2569 (Канцэлярыя Веліжскага і Суражскага ваеннага начальніка).

Архіўныя матэрыялы, якія захоўваюцца за межамі нашай краіны прадстаўлены ў зборніках: "Каліноўскі К. За нашу вольнасць. Творы, дакументы." [13], "Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии" [10], а таксама ў працы У.Ратча "Сведения о польском мятеже 1863 г." [22].

Асобныя бакі нацыянальна-вызваленчага руху ў Віцебскай губерні закранаюцца ў некаторых навуковых артыкулах. Прыкладам, звесткі пра сувязі рэвалюцыянераў Расіі і Беларусі ў перыяд паўстання ўтрымліваюцца ў працах А.Смірнова "Революционные связи народов России и Польши 30-х – 60-х гг. XIX века" [24] і Я.Віткоўскага "Зямля і Воля" 60-х гг. і яе сувязь з паўстаннем 1863 г." [9]. Спроба даць характарыстыку дзейнасці паўстанцкай адміністрацыі змешчана ў артыкуле Сымона Барыса "Сістэма кіравання паўстаннем 1863-1864 гг. у Літве і Беларусі" [25]. Аб ролі сялян Віцебскай губерні ў паўстанні 1863 г. пісалі С.Самбук "Сяляне і паўстанне 1863 г."[11] і Д.Васілеўскі "Сялянства Віцебскай і Магілеўскай губерань у паўстанні 1863 г." [6]. Адзінай рэальнай спробай статыстычнага аналізу сацыяльна-саслоўнага складу ўдзельнікаў паўстання ёсць праца У. Зайцава "Социально-сословный состав участников восстания 1863-64 гг. в Литве и Белоруссии"[12].